НЕСПАДЗЯВАНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ

Як не згубіцца ў лесе?

Цёплае і вільготнае надвор'е, якое вось ужо чацвёрты тыдзень з невялікімі перапынкамі пануе ў Беларусі, штурхае да таго, каб пайсці ў лес. Па-першае, там можна схавацца ад духаты і спякоты, а па-другое, там ужо з'явіліся першыя дары — так, на Камароўцы ўжо актыўна ідзе гандаль чарніцамі, суніцамі і нават лісічкамі.

Але паход у лес — далёка не заўжды бяспечная рэч. На мінулым тыдні ў Магілёўскім раёне шукалі 69-гадовага пенсіянера. Жыхар вёскі Салтанаўка пайшоў у лес і знік. Пра гэта паведамілі ратавальнікам, а таксама дадалі, што мабільны тэлефон старога недаступны.

Шукаць чалавека адправіліся ратавальнікі, міліцыянеры і мясцовыя жыхары. Неўзабаве яго знайшлі. Высветлілася, што пенсіянер праваліўся ў люк тэхналагічнага калодзежа на тры метры ніжэй за ўзровень зямлі. Яго перадалі брыгадзе медыкаў.

Раніцай 22 чэрвеня ў Мядзельскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях пазваніў дзяжурны мясцовага аддзела ўнутраных спраў. Ён паведаміў, што неабходная дапамога — каля вёскі Коркі згубіўся 82-гадовы мужчына. Аказалася, што напярэдадні апоўдні ён сышоў у лес і дагэтуль не вярнуўся. А мабільнага тэлефона не мае.

У першы дзень мядзельскія ратавальнікі і міліцыянеры прачэсвалі ўсе магчымыя маршруты, па якіх мог ісці стары. У іх лік трапілі і ўчасткі лесу. Але надышоў вечар, а чалавек усё яшчэ не быў знойдзены. Раніцай 23 чэрвеня прыбыла дапамога — байцы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння і пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада Мінскага абласнога ўпраўлення МНС. Падключыліся да пошукаў і неабыякавыя мясцовыя жыхары. І гэта дало плён. Праз тры з паловай гадзіны небараку знайшлі ў полі каля вёскі Хоневічы.

Яшчэ аднаго 82-гадовага мужчыну шукалі ў Бярэзінскім раёне. 18 чэрвеня жыхар вёскі Мачаск сышоў адзін у лес. Праз тры дні ён сам выйшаў з лесу — за некалькі кіламетраў ад сваёй вёскі. У медыцынскай дапамозе ён не меў патрэбу.

Але губляюцца ў лясах не толькі пенсіянеры, але і дзеці. Удзень 16 мая сям'я гуляла паблізу лясного масіву каля вёскі Слабада Смалявіцкага раёна. Раптам у лес ірвануў сабака. Хлопчык пабег за ім і тут жа знік з поля зроку.

Перапалоханы бацька тут жа патэлефанаваў ратавальнікам і паведаміў пра тое, што адбылося. На месца падзей яны выбылі разам з міліцыянерамі. 10-гадовы малы знайшоўся неўзабаве.

Як жа правільна падрыхтавацца да паходу ў лес? Пра гэта расказвае афіцыйны **прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настасся ШВАЙБОВІЧ.**

— Падрыхтоўка да паходу ў лес павінна ісці грунтоўна. Пры сабе абавязкова трэба мець нож, запалкі і ваду, а таксама патрэбныя лекі. Зарадзіце перад выхадам мабільны тэлефон. Калі ён падтрымлівае сілкаванне ад знешняга акумулятара — выдатна. У лесе з-за няўстойлівага прыёму батарэя ў тэлефоне можа разраджацца хутчэй. Важна правільна падабраць адзенне для паходу ў лес. Камуфляж, які карыстаецца істотным попытам, — дрэнны памочнік. Калі вы заблукаеце, то адзенне колеру хакі выканае сваю функцыю на ўсе сто працэнтаў і схавае вас ад вачэй пошукавікаў... Таму хоць нешта яркае трэба мець абавязкова — скажам, хустку ці шапку. Агульнае патрабаванне для адзення і абутку — яны павінны быць шчыльныя і непрамакальныя. Гэта засцеражэ вас ад укусаў кляшчоў, а калі вы раптам трапіце на багну, то ў вас не прамокнуць ногі. Папрасіце пажылых сваякоў ні ў якім разе не хадзіць у лес у адзіночку.

Заблукаць у лесе без арыенціраў вельмі проста. Справа ў тым, што ў чалавека адна нага крыху большая за другую. Розніца складае літаральна некалькі міліметраў. У населеным пункце гэта непрыкметна — мы міжволі выпраўляем крок, арыентуючыся на дарогу. У лесе такога арыенціру няма. Як вынік — чалавек, які заблукаў, пачынае апісваць кругі радыусам тры–чатыры кіламетры.

Калі ніякай дарогі паблізу няма і на крыкі аб дапамозе ніхто не адгукаецца, то трэба прыслухацца да гукаў навокал. Шум матора трактара чуваць за тры–чатыры кіламетры, сабачы брэх — за два–тры. Грузавы цягнік можна пачуць за 10 кіламетраў ад чыгункі. Калі нешта такое чуецца — ідзіце на гук. Любыя лініі электраперадачы, прасекі і сцяжынкі абавязкова выводзяць «у цывілізацыю». Ручай ці рака таксама могуць быць добрымі памочнікамі. Іх вытокі нярэдка знаходзяцца ў глухіх мясцінах, таму трэба ісці ўніз па цячэнні. І канешне ж, пазваніце ратавальнікам і раскажыце пра тое, з якога населенага пункта і якога раёна ўвайшлі ў лес, апішыце, што бачыце па баках.

Калі ж сонца пачало заходзіць, а вы так і не выбраліся з лесу, — трэба рабіць месца для начлегу. Тут таксама ёсць свае асаблівасці. Лепш за ўсё падыдзе яма, якая ўтварылася ад вывернутага з коранем дрэва. З яго галін можна зрабіць часовы прытулак кшталту будана. Зменшыць страты цяпла дапаможа або папера, або лісце, набітае пад вопратку. Побач з буданам лепш павесіць які-небудзь прадмет адзення — ён зверне на сябе ўвагу тых, хто вас шукае.

Небяспечная рэч — сустрэць падчас вандровак па лесе пажар. Імавернасць гэтага даволі істотная, асабліва калі ўлічыць, што, па звестках Міністэрства лясной гаспадаркі, па стане на 28 чэрвеня забарона на наведванне лясоў дзейнічае ў 36 раёнах краіны. Усяму прычынай — спякотнае надвор'е.

Калі вы ўбачылі ўзгаранне, то абавязкова трэба пазваніць на тэлефон «101» ці «112», паведаміць пра тое, што адбылося, і тут жа пакінуць месца пажару. Трэба ісці перпендыкулярна кірунку ветру або кромцы пажару. У сухое надвор'е і пры ветры недагаркі галля, лісце, вуголле пераносяцца на дзясяткі метраў. Пры верхавых лясных пажарах, калі гараць кроны дрэў, сховішчам могуць служыць берагі вадаёмаў, буйныя паляны, ліставы лес без хвойніку. А вось на дарогах і прасеках, акружаных хваёвым лесам, шукаць прытулак не трэба. Гэта датычыцца і лагоў, якія параслі лесам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Будзь у курсе!

ЗАПРАШАЕ «СТАЛІЧНЫ ЭКСПРЭС»

Дзіцячая чыгунка імя К. Заслонава 9 ліпеня адкрые 65-ы юбілейны сезон

Першы цягнік «Сталічны экспрэс» адправіцца з перона станцыі Заслонава 9 ліпеня ў 11.00. Пасажыры праедуць па традыцыйным маршруце — ад станцыі Заслонава праз станцыю Піянерская да станцыі Сасновы Бор і назад.

Як паведамляе прэс-цэнтр Беларускай чыгункі, у летнім сезоне — 2020 цягнік будзе курсіраваць па серадах, чацвяргах і пятніцах з 11.00 да 14.09 і рабіць чатыры рэйсы (у 11.00, 11.38, 12.57, 13.35), а па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.04 і рабіць шэсць рэйсаў (у 11.00, 11.38, 12.57, 13.35, 14.52, 15.31).

У верасні здзейсніць падарожжа на «Сталічным экспрэсе» можна будзе па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.04. Цягнік будзе рабіць шэсць рэйсаў (у 11.00, 11.38, 12.57, 13.35, 14.52, 15.31).

Завершыцца 65-ы юбілейны сезон 20 верасня.

З мэтай захавання здароўя юных пасажыраў, прафілактыкі распаўсюджвання вірусных інфекцый, а таксама стварэння камфортных умоў праезду ў цягніку «Сталічны экспрэс» прадугледжана рассадка з улікам сацыяльнай дыстанцыі. Акрамя таго, на працягу ўсяго дня штогадзінна будзе праводзіцца санітарная апрацоўка рухомага саставу.

Навінкай 65-га юбілейнага сезона стала магчымасць набыцця білетаў на цягнік «Сталічны экспрэс» праз інтэрнэт-сэрвіс па продажы квіткоў ByCard. Таксама білеты можна набыць у касе на вакзале станцыі Заслонава Дзіцячай чыгункі (пр-т Незалежнасці, 86).

Кошт праезду складае чатыры рублі.

Больш падрабязную інфармацыю аб рабоце Дзіцячай чыгункі можна атрымаць па тэлефоне ў Мінску 237-65-75, а таксама на сайце Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі minsk.rw.by.

Дзіцячая чыгунка запрашае мінчан і гасцей сталіцы здзейсніць займальнае падарожжа на цягніку «Сталічны экспрэс» і атрымаць незабыўныя ўражанні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАТАРЫУС БЯСПЛАТНА ПРАЗ МЕСЕНДЖАР

У перадсвяточны дзень 2 ліпеня ў натарыяльных бюро і канторах Беларусі натарыусы пракансультуюць усіх ахвотных па пытаннях, якія звязаны са здзяйсненнем натарыяльнага дзеяння. Адказ на свой запыт можна атрымаць таксама па тэлефоне ці з дапамогай месенджараў.

Цягам дня грамадзяне, якія звернуцца да натарыусаў, змогуць даведацца, напрыклад, як аформіць спадчыну, скласці завяшчанне, шлюбны дагавор, дакумент на адчужэнне маёмасці і здзяйсненне выканаўчых надпісаў.

Патэлефанаваўшы ў натарыяльнае бюро ці кантору, можна ўзгадніць найбольш зручны фармат кансультацыі, у тым ліку праз відэасувязь. Час работы бюро і кантор спецыялісты раяць удакладняць на сайце беларускай натарыяльнай палаты belnotary.by ў раздзеле «Знайсці натарыуса».

Ірына СІДАРОК.

На слыху

Каб адпачынак быў бяспечны...

Міністэрства аховы здароўя і Рэспубліканскі цэнтр па санаторна-курортным лячэнні распрацавалі часовыя рэкамендацыі для санаторна-курортных арганізацый па прафілактыцы завозу каранавіруснай інфекцыі.

Такім чынам, адпачывальнікі павінны прадставіць даведку аб адсутнасці кантактаў з хворымі на COVID-19 цягам апошніх 14 дзён, выдадзеную тэрытарыяльнай паліклінікай ці тэрытарыяльным цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі. Такую ж даведку запатрабуюць і ад замежных грамадзян. Санаторыі павінны прадугледзець аднамомантны заезд і выезд адпачывальнікаў з перапынкамі паміж заездамі для генеральнай прыборкі і дэзінфекцыі.

Падчас заезду адпачывальнікам будуць праводзіць тэрмаметрыю, падчас рэгістрацыі забяспечаць дыстанцыраванне. Засяляць гасцей плануюць па адным у нумар, у агульны нумар могуць засяліць толькі членаў сям'і, якія прыбылі разам.

У санаторыях будзе арганізавана штодзённая прыборка памяшканняў з дэзінфіцыруючымі сродкамі, у тым ліку ўсіх паверхняў, а на вуліцы — апрацоўка малых архітэктурных формаў (спартыўных пляцовак, альтанак, лавак, пляжнага абсталявання). У нумарах забяспечаць кантроль за наяўнасцю мыла і туалетнай паперы. Памяшканні будуць як мага часцей праветрываць.

Прыярытэт рэкамендавана аддаваць харчаванню ў нумарах ці па сістэме замоў. У сталоўках сталы будуць расстаўляцца на дыстанцыі 1,5-2 метры, час прыёму ежы для адпачывальнікаў будзе размежаваны, каб аднамомантна ў абедзенай зале знаходзілася мінімальная колькасць людзей.

Медыцынскія паслугі будуць аказвацца індывідуальна, па папярэднім запісе. Пасля кожнай працэдуры прадугледжаны праветрыванне і дэзінфекцыя памяшкання і абсталявання. Культурна-масавыя мерапрыемствы абмяжуюць. Персанал будзе працаваць пераважна вахтавым метадам.

Алена КРАВЕЦ.

ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ЗАО «Райагропромэнерго»** (УНП 700003443) в лице ликвидатора Осипенко А. Г., тел. +375 29 155-37-27.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **14 июля 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

ЗДАНИЕ МНОГОФУНКЦИОНАЛЬНОЕ, с инв. № 710/С-74354, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188, ЗДАНИЕ КОТЕЛЬНОЙ, с инв. № 710/С-2705, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/1, ЗДАНИЕ РАСПРЕДЕЛИТЕЛЬНОГО УСТРОЙСТВА, с инв. № 710/С-74953, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/2.

Начальная цена предмета торгов – 140 000,00 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 155-37-27.

Для участия в торгах необходимо в срок с 02.07.2020 г. 09.00 по 13.07.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 11.06.2020 г.